учащихся. Значительно возросла инновационная компетентность учителей, их творческое мастерство, профессиональный рост, на 25 % увеличилось количество педагогов, включенных в социально-значимую деятельность по сравнению с прошлыми годами. Максимально включен в воспитательный процесс школы потенциал семьи. Консультант и администрация школы попытались проанализировать и учесть факторы риска, с которыми столкнулась школа в процессе реализации инновационного проекта, особенно на начальном его этапе, и разработали пути их преодоления. Сформировалось видение перспектив развития школы, как у педагогического коллектива, так и у учащихся и их родителей, а также повышения ее конкурентоспособности. В связи с этим проявилось желание всех участников инновации формировать позитивный имидж школы, активизировать участие в социально-значимых мероприятиях школы, района, города, области. В целом благодаря созданию в школе ДОО «Поиск» обновилось содержание воспитательных программ и планов с ориентацией на достижение целей инновационного проекта по воспитанию социально-активной личности учащихся.

***В.А. Ляшчынская, З.У. Шведава***
*г. Гомель, УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”*

## ЛІНГВАЭТНАКУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ КАМПАНЕНТ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў СЯРЭДНЯЙ І ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ

Беларуская мова і маўленчая культура не сталі яшчэ нормай культурнага быцця большасці беларусаў, што ў выніку не стварае беларускамоўнага асяроддзя для новых пакаленняў носьбітаў беларускай мовы. Асаблівая праблема з авалоданнем практычным выкарыстаннем беларускай мовы ў школе. Вучні, вывучаючы беларускую мову на ўроках у школе, амаль поўнасцю пазбаўлены беларускамоўнага акружэння як у школе, паколькі ўсе астатнія прадметы вывучаюцца на рускай мове, так і па-за школы. Разам з тым нацыянальная культура і мова як яе першаэлемент нясуць у сабе вялікі сацыяльна-педагагічны патэнцыял, які далёка не ў поўнай меры рэалізуецца ў вучэбна-выхаваўчым працэсе і ў фарміраванні асобы як носьбіта каштоўнасцей і традыцый беларускай культуры, як прадаўжальніка і прапагандыста іх.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Мова і культура народа непарыўна звязаны: мова – гэта важнейшы выразнік культуры, а культура выяўляецца, фарміруецца і захоўваецца праз мову. Увага і скіраванасць да ўзаемасувязі трыяды ‘мова – чалавек – культура’ пры навучанні мове ў наш час сталі не толькі магчымым, але і неабходным. Актуальнасць гэтых пытанняў стала магчымым дзякуючы новай парадыгме навуковага даследавання мовы, якая разглядаецца не толькі як сістэма моўных сродкаў, але і сродак пазнання народа як як носьбіта.

Сёння ў адпаведнасці з законам нашай краіны “Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь” дзяржаўная адукацыйная палітыка сярод разнастайнасці палажэнняў выдзяляе два найважнейшыя для нашай краіны: нацынальна-культурная аснова адукацыі і экалагічная накіраванасць адукацыі. А таму адной з задач навучання беларускай мове з’яўляецца фарміраванне этнакультуразнаўчай кампетэнцыі вучняў, а адным з лінгвадыдактычных прынцыпаў навучання з’яўляецца прынцып апоры на этнакультуру. Уключэнне этнакультуразнаўчага кампанента, арыентацыя пры адборы матэрыялаў да заняткаў па беларускай мове на тэксты з этнакультуразнаўчай тэматыкай (гісторыя Беларусі, характар, звычкі, традыцыі, асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, прыродныя ўмовы, раслінны і жывёльны свет, месцы і паселішчы і іх найменні, імёны, прозвішчы знакамітых беларусаў і інш.) спрыяе не толькі паспяховаму засваенню моўнага матэрыялу, але ў большай ступені фарміраванню нацыянальнай свядомасці асобы вучня. Дыдактычны матэрыял да ўрокаў павінен быць не толькі сродкам для назірання за моўнымі з’явамі, крыніцай для іх выдзялення ці аб’ектам для іх аналізу. Важным аспектам выкарыстання тэкстаў з’яўляецца іх змест, тая інфармацыя, якая павінна быць засвоена. Беларусы павінны ведаць, што яны беларусы, выхоўваць сябе як беларусаў, ідэнтыфікаваць сябе з беларускай культурай.

Разам з тым, незалежна ад таго, з якой культурай пэўныя вучні сябе ідэнтыфікуюць (з улікам шматнацыянальнага складу насельніцтва рэспублікі, а значыць і вучняў у школе, класе), у працэсе навучання беларускай мове патрэбна ўлічваць этнакультурны фактар, ствараць умовы для пазнання культуры беларускага народа і іншых народаў і выхавання талерантных адносін паміж людзьмі, якія належаць да розных этнасаў, канфесій, рас, але падкрэсліваць культурную адметнасць беларусаў.

Асноўная ўвага ў навучанні беларускай мове акцэнтавана на падбор тэкстаў, на высвятленне асноўных паняццяў, тыпаў,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

уласцівасцей і прыкмет тэкстаў, на распрацоўку сістэмы работы з тэкстамі, у сувязі з тым, што тэксты дазваляюць не столькі выявіць месца і ролю моўных адзінак, колькі быць аб'ектам назіранняў для выяўлення правілаў і законаў пабудовы новых, другасных тэкстаў пэўнага тыпу, стылю, жанру, выяўленню іх структуры, сродкаў і спосабаў звязанасці сказаў у межах больш буйных адзінак тэксту і гэтых адзінак паміж сабой, устанавіць прагматычныя і стылістычныя мэты і задачы выкарыстання пэўных сродкаў мовы і іх дыферэнцыяцыі, ці спрыяць тэкстатворчасці; яны служаць узорам для маўленчай творчасці навучэнцаў, яны з'яўляюцца крыніцай пазнання пэўнай унікальнай культурнай інфармацыі, ці дапамагаць асэнсаванню і засваенню яе.

Яшчэ адной і найбольш важнай падставай для выкарыстання тэкстаў на занятках па беларускай мове з'яўляецца неабходнасць выхавання і фарміравання навучэнцаў як прадстаўнікоў беларускага народа, жыхароў Беларусі з іх унікальнай мовай, культурай. І гэта звязана з тым, што тэкст лічыцца "сапраўдным стыкам лінгвістыкі і культуралогіі, таму што ён належыць мове і з'яўляецца яго найвышэйшым ярусам, у той жа час тэкст ёсць форма існавання культуры" (В.А. Маслава). У выніку важным крытэрыем выбару тэксту з'яўляецца яго лінгвакультуралагічная адпаведнасць.

Тэксты з'яўляюцца сапраўднымі захавальнікамі культуры кожнага народа. Далучэнне навучэнцаў да культуры адбываецца шляхам прысваення ім "чужых" тэкстаў. Менавіта тэкст захоўвае інфармацыю пра гісторыю, этнаграфію, нацыянальную псіхалогію, нацыянальныя паводзіны, г. зн. пра ўсё, што складае змест культуры.

Мэтанакіраванае і сістэматычнае выкарыстанне тэкстаў з этнакультуразнаўчай тэматыкай паслужыць асновай для выпрацоўкі лінгвакультуразнаўчай кампетэнцыі вучняў. Дзякуючы выкарыстанню тэкстаў, якія можна разглядаць і як змясцілішча пэўнай інфармацыі, якую патрэбна засвоіць, і як унікальны, створаны адметнасцю, своеасаблівасцю асобы аўтара твор, а яшчэ ў большай ступені дзякуючы аналізу тэкстаў выпрацоўваецца культурна-моўная кампетэнцыя носьбітаў мовы. Яны авалодваюць такімі працэсамі, як тэкстаўспрыманнем і тэкстанараджэннем, а таксама прынятымі для кожнага народа і замацаванымі ў мове пэўнымі ўстаноўкамі культуры.

Нацыянальна-культурная семантыка прысутнічае на ўсіх узроўнях мовы: і ў граматыцы, і ў фанетыцы. Аднак найбольш поўна і выразна яна праяўляецца ў будаўнічых адзінках мовы, якія непасрэдна адлюстроўваюць пазамоўную рэчаіснасць, называюць прадметы і з'явы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

акаляючага нас свету – гэта лексічныя і фразеалагічныя адзінкі, прадстаўленыя не столькі ізалявана, колькі ў маўленчай дзейнасці і, асабліва, яго выніку – тэкстах этнакультуралагічнай накіраванасці, якія выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе.

Актуальнасць інавацыйнай дзейнасці і яе ўкаранення ў вучэбна-выхаваўчы працэс установы адукацыі абумоўлены таксама неабходнасцю далучэння навучэнцаў да даследча-пошукавай працы. Вось чаму праблема захавання духоўнай спадчыны беларусаў і, найперш, мовы іх, а таксама пашырэнне інфармацыі пра культурныя здабыткі, фарміраванне нацыянальна свядомай моладзі, актыўнай, творчай, сталі прадметам навуковага вывучэння і практычнай рэалізацыі ў школьным навучанні беларускай мове і выхаванні навучэнцаў.

Вучоныя ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны” даўно і плённа працуюць над вырашэннем актуальнай праблемы выкладання і ўдасканалення працэсу навучання беларускай мове ў сярэдняй і вышэйшай школе. У выніку кантрольных і спецыяльных зрэзаў на прадмет авалодвання мовай, ступені ўжывальнасці і пашыранасці яе ў пазаўрочны час настаўнікамі і вучнямі, метадычных асноў выкладання і многіх іншых пытанняў, так ці інакш звязаных з вывучэннем і авалодваннем беларускай мовай, падрыхтавана спецыяльная літаратура, прысвечаная праблемам арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, яго ўдасканаленню, вырашэнню многіх пытанняў навучання беларускай мове і выхавання сродкамі мовы. З мэтай пашырэння і ўкаранення ў працэс навучання беларускай мове прапануем тэарэтычныя асновы інавацынай праграмы па выпрацоўцы этнакультуразнаўчай кампетэнцыі маладога пакалення:

*Навукова-метадычная гіпотэза:* у працэсе выпрацоўкі лінгваэтнакультуралагічнай кампетэнцыі фарміруецца беларускамоўная асоба, актыўная, нацыянальна свядомая, талерантная ў адносінах да іншых народаў з іх мовамі, культурай, гісторыяй, творчая, з выпрацапванымі навыкамі самастойнай і даследчай работы.

*Мэта:* распрацаваць сістэму працы ўстановы адукацыі і асобных настаўнікаў для інтэлектуальнага асобаснага развіцця вучняў у працэсе выпрацоўкі лінгваэтнакультуралагічнай кампетэнцыі вучняў, для падрыхтоўкі беларускамоўнай асобы.

*Задачы:*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1 Стварыць умовы для рэалізацыі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе фарміравання беларускамоўнай асобы як носьбіта, прадажаўльніка і прапагандыста каштоўнасцей і традыцый беларускага народа.

2 Распрацаваць сістэму работы па выкарыстанні лінгваэтнакультуралагічных матэрыялаў на ўроках беларускай мовы і ў пазакласнай рабоце настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры.

3 Вывучаць і прапагандаваць вопыт укаранення інавацыйнай праграмы шляхам аналізу вынікаў навучання (авалоданне беларускай мовай у вуснай і пісьмовай формах) і выхавання (прымяненне навыкаў і ўменняў выступаць перад аўдыторыяй, выказвацца на ўзнятую і блізкую тэму, весці дыскусіі паводле правілаў і нормаў – выслухаць, не перабіваць, даказваць з дапамогай аргументаў, кантраляваць тон эмоцыі і інш.).

4 Арганізаваць працу па прапагандзе і пашырэнню інавацыйнай кампетэнтнасці настаўнікаў беларускай мовы ва ўстановах адукацыі праз Абласны інстытут развіцця адукацыі, падрыхтоўку публікацый педагогаў, удзельнікаў інавацыйнага праекта ўстановы ў друку.

5 Развіваць у вучняў цікавасць да пазнання жыцця, гісторыі беларускага народа ў яго тэрытарыяльнай, этнічнай, гістарычнай і сацыяльнай акрэсленасці, да даследчай працы па пытаннях сучаснай беларускай літаратурнай мовы, яе гісторыі, ролі і месца ў грамадстве, сярод моў іншых народаў, параўнання культуры народаў і спосабаў яе выражэння і замацавання ў мове.

*Актуальнасць* інавацыйнай праграмы па распрацоўцы і ўкараненні ў вучэбна-выхаваўчы працэс дзяржаўнай установы адукацыі абумоўлена наступнымі фактарамі:

– распрацоўка дадзенага накіравання з’яўляецца заканамерным і лагічным працягам працы, якая праводзіцца ў школе настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры па гуманістычнаму і эстэтычнаму выхаванню і адукацыі, наяўнасцю вопыту эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці і станоўчых вынікаў гэтай працы;

– узрастаннем патрэб педагогаў і бесперапынным павышэннем прафесійнай кампетэнтнасці;

– наяўнасцю творчых сувязей паміж установамі, якія займаюцца праблемамі адукацыі і выхавання моўнай асобы;

– нізкім паказчыкам ролі беларускай культуры і мовы як фактараў самаідэнтыфікацыі;

– наяўнасцю ў мове і культуры народа значнага сацыяльна-педагагічнага патэнцыялу і яго няпоўным выкарыстаннем.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ